Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# Чырвоная Зьмена

№ 34 (1303) ‖ ЧАЦЬВЕР, 12-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАНЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

## Тав. Чэмаданаў—палітсэкратар ВК КІМ'у

МАСКВА, 11 Гэтымі днямі скончылася пасяджэньне пашыранага прэзыдуму Выканкому КІМ'а.

Прэзыдыум абгаварыў наступныя пытаньні:

1. Барацьба з ваеннай небясьпекай і фашызмам:
2. Справаздачны даклад ЦК КСМ Нямеччыны.

У сувязі з перадачай на партыйную работу раду таварышоў, у тым ліку т. т. Хітрава, Горкіча і Фюрэнбэрга, прэзыдыум абраў новы склад сэкратарыяту.

Палітсэкратаром прэзыдыум аднагалосна абраў тав. Чамаданава, оргсэкратаром тав. Мюльлера.

## Вышыні якасьці павінны быць узяты

Наша прамысловасьць у галіне барацьбы за якасьць продукцыі значна адстала. Мы прыступілі да выкананьня кантрольных лічбаў рашаючага 3-га году пяцігодкі і перад намі паўстае задача ўзьняць вытворчасьць краіны на 45 проц. А гэта значыць—зрабіць нябачаны ў гісторыі скачок уверх, бо „мы адсталі ад перадавых краін на 50—100 год, мы павінны прабегчы гэтую адлегласьць за дзесяць год. Альбо мы зробім гэта, альбо на сатруць“ (СТАЛІН)

Вось чаму асаблівую ўвагу на сёньнешні дзень неабходна зьвярнуць на ажыцьцяўленьне лёзунгу, высунутага IX зьездам Усе ЛКСМ: „Змагацца на тэмпы плюс якасьць“. У гэтай барацьбе, як і ва ўсёй барацьбе комсамолу, мы павінны пераматчы і мы пераможам.

Студзень месяц даў некаторае недавыкананьне прамфінпляну амаль па ўсіх паказчыках. У барацьбе за тэмпы плюс якасьць допушчаны значны прарыў.

Перад комсамольскай організацыяй, як галоўная задача дня, паўстае неабходнасьць скарыстаць усе мажлівасьці, усе формы соц. спаборніцтва ў справе ажыцьцяўленьня рашэньняў нашых комсамольскіх зьездаў, у галіне паглыбленьня павароту тварам да вытворчасьці для таго каб, кантрольныя лічбы па ўсіх паказчыках былі выкананы.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на выкананьне якасных паказчыкаў прамфінпляну. Тут у нас канчаткавага пералому яшчэ няма.

Высунутая комсамольцамі Віцебскай фабрыкі імя Лекерта і „Чырвонай Зьменай“ ініцыятыва стварыць скразны соцыялістычны конвэер якасьці зараз ператвараецца ва ўсебеларускі паход рабочай моладзі, на чале з комсамолам, за якасьць продукцыі і зьніжэньне сабекошту, не допушчаючы зьніжэньня па агульных паказчыках росту.

Гомельская абутковая фабрыка „Праца“ ўключылася ў конвэер і разгарнула вялікую работу, каб увязаць барацьбу за тэмпы з барацьбою за якасьць. Фабрыка абвясьціла ўдарны двесяцідзёньнік і выставіла конкрэтныя патрабаваньні да тых прадпрыемстваў, якія забясьпечваюць яе сыравінай і паўфабрыкатам. Яна выставіла свае патрабаваньні ня толькі гарбарням, але і чыгунцы і Вяцкаму драўлянацьвіковаму заводу, які павінен забясьпечыць фабрыку найлепшай якасьці продукцыяй.

Такім чынам, скразны конвэер якасьці перакідаецца на іншыя галіны вытворчасьці, і высунутая нарадай эконоработнікаў Гомелю па гэтаму пытаньню прапанова стварыць конвэер якасьці ў мэталюргічнай прамысловасьці і будаўніцтве заслугоўвае асаблівае ўвагі. Гэтая ініцыятыва павінна зараз-жа, перад пачаткам будаўнічага сэзону, ператварыцца ў жыцьцё.

Адначасова з гэтым, нашы прадпрыемствы зьвязаны з прадпрыемствамі іншых саюзных рэспублік. Сёньня мы зьвяртаемся да ўсёй рабочай моладзі і комсамолу Украіны, да цэнтральнага органу ўкраінскага комсамолу—газэты „Комсамолец Украіны“ з тым, каб украінскі комсамол, падхапіўшы ініцыятыву і вопыт скразнога конвэеру якасьці, забясьпечыў свой актыўны ўдзел у яго праводзеньні і прыклаў-бы ўсе сілы, каб конвэер якасьці ператварыўся ва ўсесаюзны паход рабочай моладзі, на чале з комсамолам, на барацьбу за якасьць.

Скразны конвэер якасьці, які зьяўляецца вышэйшай формай соцспаборніцтва, дае вялікую магчымасьць праявіць творчую ініцыятыву працоўных і організаваць усе сілы на барацьбу за якасьць продукцыі, за зьніжэньне сабекошту і поўнае выкананьне кантрольных лічбаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

## Падатак узыскан уперад да 1936 году

ПЭЙПІН,--Корэспондэнт газэты „Да-гун-Бао“ у нарысе аб становішчы паўночнай часткі провінцыі Хэнань піша: „Неймаверна цяжкія падаткі выклікаюць моцнае незадаваленьне сялян. Зямельны падатак сабраны ўперад да 1936 году. Пасьля ўплаты зямельнага падатку сяляне застаюцца жабракамі“.

## Супроць голаду, за соцыяльнае страхаваньне



Амаль штодзённа ў Нью-Ёрку адбываюцца мітынгі і дэманстрацыі беспрацоўных, якія патрабуюць соцыяльнае страхаваньне ад беспрацоўя. Дэманстрацыі і мітынгі жорстка разганяюцца паліцыяй.

На здымку: Паліцыя арыштоўвае беспрацоўных, якія паспрабавалі выступіць на мітынгу беспрацоўных.

## Савецкі ўрад згадзіўся прыняць удзел у рабоце камісіі па вывучэньню Пан-Эўропы

### Абмен лістамі паміж генэральным сэкратаром Лігі Нацый і т. Літвінавым

На імя народнага камісара па замежных справах тав. Літвінава атрыман ад генэральнага сэкратара Лігі Нацый ліст наступнага зьместу:

Жэнэва, 23 студзеня 1931 г.

**Пан народны камісар!**

Маю гонар давесьці да Вашага ведама, што на пасяджэньні ад 20 студзеня 1931 году камісія па вывучэньню пытаньня аб эўропейскім саюзе прыняла наступную рэзолюцыю:

„Прымаючы пад увагу рэзолюцыю пленарнага сходу Лігі Нацый ад 17 верасьня 1930 г., камісія па вывучэньню пытаньня аб эўропейскім саюзе пастанаўляе вывучыць сусьветны эканамічны крызіс, паколькі ён закранае ўсе эўропейскія дзяржавы і запрасіць праз пасрэдніцтва генэральнага сэкратарыяту да ўдзелу ў гэтай рабоце ўрады Ісляндыі, Турцыі і СССР“. Прычым, прыкладаецца памянёная вышэй рэзолюцыя пленарнага сходу Лігі Нацый. Я дазволю сабе прыслаць Вам дадаткова ўсе дакуманты камісіі па вывучэньню пытаньня аб эўропейскім саюзе. Наступная сэсія гэтай камісіі адбудзецца ў маі месяцы. Дакладная дата сэсіі будзе ўстаноўлена пазьней. Зрабеце ласку і паведамеце мяне, ці прымае Ваш урад запрашэньне, якое мне даручана перадаць Вам ад імя камісіі па вывучэньню пытаньня аб эўрапейскім саюзе.

Прымеце, пан народны камісар, маё ўпэўненьне ў глыбокай да Вас пашане.

**Часова выконваючы абавязкі генэральнага сэкратара — Авэноль“.**

У адказ на ліст часова выконваючага абавязкі генэральнага сэкратара Лігі Нацый Авэноля, народны камісар па замежных справах СССР, тав. Літвінаў наслаў наступны ліст:

### Адказ наркома замежных спраў т. Літвінава генэральному сэкратару Лігі Нацый

6 лютага 1931 году.

**Пан генэральны сэкратар!**

Я атрымаў Ваш ліст ад 23 студзеня, ў якім паведамлялася, што камісія вывучэньня эўрапейскага аб'яднаньня пастанавіла вывучыць сусьветны эканамічны крызіс, паколькі ён цікавіць іншыя эўрапейскія дзяржавы і запрасіць для ўдзелу ў гэтым вывучэньні СССР.

Мяркуючы па адказах розных урадаў на вышэйпамянёны мэморандум францускага ўраду адносна мэт, намечаных для новай організацыі мэтодаў дасягненьня гэтых мэт,—існуе мноства розногалосьсяў.

У савецкага ўраду ёсьць свая концэпцыя аб прычынах пастаянна існуючых экономічных супярэчнасьцяй паміж дзяржавамі і аб прычынах, пэрыодычна ўзьнікаючых у капіталістычных краінах экономічных дэпрэсій і крызісаў, а таксама аб тых шляхох, да якіх чалавецтва павінна імкнуцца і па якіх яно можа дасягнуць сапраўднай салідарнасьці народаў. Але наўрад ці ёсьць патрэбнасьць гэту концэпцыю тут выкладаць. Аднак, ня можа не праўстаўляцца бясспрэчным для ўсіх дзяржаў тое становішча, што без забясьпечаньня унівэрсальнага міру, наогул і, эўропэйскага ў прыватнасьці, бяз зьнішчэньня прычын пагражаючых парушэньню гэтага міру, ня можа быць і гутаркі аб пасьпяховасьці якіх-бы там ні было імкненьняў да ўстанаўленьня эўропэйскай салідарнасьці ў экономічнай ці ў якіх-небудзь іншых галінах. Нават буржуазныя экономістыя прызнаюць бесперапынны рост ва ўсім сьвеце ўзбраеньняў, паглынаючы у некаторых краінах да 40-50 проц. народных бюджэтаў —з аднаго боку, і экономічнымі супярэчнасьцямі. што ўзмацняюцца паміж дзяржавамі, і экономічным крызісам гэтых дзяржаў—з другога боку.

Калі гаварыць аб аб'яднаньні Эўропы, дык здавалася-б, што ўдзел тэй ці іншай дзяржавы ў гэтым аб'яднаньні аўтоматычна вызначаецца яго географічным становішчам, якое ня можа быць зьменена ў рэзультаце якой небудзь дыскусіі, і што не павінны быць выключаны з аб'яднаньня і дзяржавы, якія прыналежаць хаця-б у нязначнай частцы сваёй да гэтага географічнага цэлага. З прычыны відавочнай бяспрэчнасьці гэтых палажэньняў, прадстаўляецца зусім не зразумелым і дзіўным, якім чынам адна група эўрапэйскіх дзяржаў магла прысвоіць сабе права вынясеньня пастаноў па пытаньні аб допушчэньні ці недопушчэньні другой групы эўрапэйскіх-жа дзяржаў. Дзіўнасьць вядома, зусім не зьменшыцца і тады, калі выступае, напрыклад, Швейцарыя (займае тэрыторыяльна 0,4 проц. Эўропы), ці нават Норвэгія (займае па тэрыторыі 3,1 проц.) супроць допушчэньня такой дзяржавы як СССР, які займае ў адной Эўропе тэрыторыю роўную каля 45 проц. усей Эўропы і які перавышае ў два разы тэрыторыю Францыі, Бэльгіі, Румыніі, Югаславіі, Швейцарыі, Гішпаніі, Голяндыі, Швэцыі, Даніі і Норвэгіі— разам узятых.

Пры пастаноўцы гэтага пытаньня прыходзіцца зусім адмесьці, як яўна нямэтазгодныя, якія-б там ня было аргумэнты формальна-юрыдычнага характару, якія былі-б зразумелымі на сходзе юрыстых, а не на міжнародным палітычным сходзе кіраўнікоў замежных ведамстваў. Калі, аднак, допусьціць, што наперакор самой назьве організацыі, якая пасылае „запрашэньне“ СССР, гутарка ідзе не аб аб'яднаньні дзяржаў Эўропы, а аб стварэньні ўнутры Эўропы дзьвёх груповак па аднаках формальна-юрыдычных або соцыяльна-палітычных, то няўхільна ўзьнікае пытаньне: ці будуць пры меркаваным супрацоўніцтве гэтых груповак забясьпечаны абедзьвум часткам роўныя і аднолькавыя правы?

Далей у пастанове камісіі па вывучэньню пан-Эўропы гаворыцца што яна пастанавіла "вывучыць сусьветны экономічны крызіс“. З гэтай пастановы аднак няясна, ці парашыла камісія абмежавацца толькі гэтым пытаньнем ці яна пакідае за сабою права ў любы момант уключыць у кола сваіх разуменьняў таксама іншыя пытаньні, а ў апошнім выпадку, мяркуецца ўдзел у абмеркаваньні гэтых пытаньняў толькі аднэй групы эўропэйскіх дзяржаў, або ўсіх дзяржаў. Гэта пытаньне, натуральна, узьнікае хаця-б ужо таму, што ў часе дэбатаў у камісіі выказвалася такая думка, што перад камісіяй могуць быць пастаўлены пытаньні, абмеркаваньне якіх у прысутнасьці прадстаўнікоў СССР было-б вельмі нязручным, прычым, ня ўказана было ясна, ці таму, што гэтыя пытаньні зусім не датычаць СССР, ці таму, што датычаць яго вельмі блізка. Калі гэта думка ўспрынята будзе ўсёй камісіяй, дык можа стварыцца такое становішча, калі СССР будзе прымаць удзел у работах камісіі, якая паклапоціцца аб ахіленьні ўдзелу яго прадстаўнікоў у пытаньнях, якія бліжэй за ўсё яго датычаць і больш усяго яго цікавяць.

Разумеючы немагчымасьць атрыманьня па-за сэсіяй камісіі якіх-небудзь растлумачэньняў па вышэй адзначаных пытаньнях і магчымай для камісіі затрудненасьці ў формуляваньні ясных адказаў, савецкі ўрад вырашыў прыняць удзел у бліжэйшых работах камісіі па вывучэньню пан-Эўропы, рэзэрвуючы свае канчатковыя адносіны да яе далейшых работ да атрыманьня неабходных яму растлумачэньняў, вывучэньня ім самой камісіі і аб'яднаўчага характару намераў запрашаючай часьці камісіі.

Прымаючы гэту пастанову, савецкі ўрад кіруецца сваім пастаянным імкненьнем падтрымаць усе пачынаньні якія могуць быць накіраваны на забясьпячэньне ўсеагульнага міру і міру ў Эўропе, у прыватнасьці, выходзячы пры гэтым таксама з тэарэтычна прызнаных у мэмарандуме Францыі палажэньняў аб сувэрэнітэце ўсіх дзяржаў, аб раўнапраўі іх, а таксама аб тым, што новая організацыя не павінна быць супроцьстаўлена ніякай этнічнай групе на другіх континэнтах, альбо ў самай Эўропе.

Прымеце ўпэўненьне і г. д.

**М. Літвінаў**

## Супроць СССР пад кіраўніцтвам Лігі Нацый

СТОКГОЛЬМ.—На сходзе аднаго з швэдзкіх ваенных саюзаў з дакладам „аб асноўных проблемах ваеннай абароны Швэцыі“ выступіў Эссэн. Эссэн апраўдваў ваенныя ўзбросньні Швэцыі і вызначыў месца Швэцыі ў імпэрыялістычным пляне нападу на Савецкі Саюз.

„У выпадку вайны супроць СССР —гаворыць дакладчык,—бальтыцкія дзяржавы—Фінляндыя, Эстонія. Латвія і Швэцыя—выступяць супроць Савецкага Саюзу пад главенствам Лігі Нацый. У Бальтыцкім моры будзе опэраваць заходні флёт.“

## Прымусовая пасылка беспрацоўных на работу

БЭРЛІН.—Біржы працы ў Рэйнскай вобласьці пасылаюць беспрацоўных ў абавязковым парадку на цяжкую работу ва Францыі. Зарплата пасланых за граніцу ледзь дасягае 17-25 кап. Працоўныя дагавары напісаны на французскай мове і большасьць рабочых пазбаўлена магчымасьці сачыць за іх выкананьнем.

Калі хто-небудзь пакідае работу да 6 месяцаў, той пазбаўляецца дапамогі па беспрацоўю. За апошнія месяцы з Рэйнскай вобласьці паслана 320 беспрацоўных ва Францыю.

# Аб рэконструкцыі рэчнага транспарту

## Да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых і водна-транспартных, профсаюзных і комсамольскіх організацый

За подпісамі старшыні СНК СССР тав. Молатава і сэкратара ЦК УсеКП(б) тав. Сталіна апублікавана адозва СНК СССР і ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, водна транспортных, профсаюзных і комсамольскіх організацый аб рэчным транспорце. Пастанова констатуе, што рост народнай гаспадаркі СССР патрабуе ад рэчнага транспорту карэннай перабудовы яго работы ў адпаведнасьці з тэмпамі разгорнутай соцыялістычнай рэконструкцыі. Гаспадарчае становішча рэчнага транспорту не адказвае ўзросшым да яго патрабаваньням з боку народнай гаспадаркі. З году ў год паўтараецца невыкананьне вытворчай програмы, не прыступлена да гэтага часу да рэконструкцыі, вельмі высокі процант аварыйнасьці, ня выканана дырэктыва ЦК аб ажыцьцяўленьні адзінаначальля, слаба разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Улічваючы ўсё гэта, СНК СССР і ЦК УсеКП(б) лічаць неабходным неадкладна правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы:

Наркомводу прапануецца ў 2-х месячны тэрмін закончыць распрацоўку пляну рэконструкцыі рэчнага транспорту. Не чакаючы поўнай распрацоўкі пляну рэконструкцыі, павінны быць устаноўлены на асобных басэйнах і відах грузаў найбольш рацыянальныя тыпы суднаў, рэкоструяваны існуючыя судна-рамонтныя майстэрні і г. д. Для гэтага павінны быць скарыстаны 215 мілн. рублёў, якія адпускаюцца на капітальныя работы ў рэчным транспорце на 1931 год.

ВСНГ абавязваецца ўстанавіць цьвёрды календарны плян па выпуску суднаў, безумоўна абавязковы да выкананьня, з тым, каб забясьпечыць выпуск у тэрмін суднаў, прызначаных да навігацыі ў 1931 годзе. У 2-х дэкадны тэрмін ВСНГ павінен замацаваць за суднабудаўнічай прамысловасьці неабходныя заводы, якія вырабляюць пасобныя механізмы, а таксама выпусьціць дадаткова з рэзервовага фонду 50 мілн. рублёў для пераабсталяваньня рэконструкцыі судна-будаўнічых заводаў і пабудовы новых верфяў у прыватнасьці Чырвонаармейскай, Пермскай і Дзячанінскай.

Наркомвод і ВСНГ павінны ў месячны тэрмін вырашыць пытаньне аб тыпе бензынавозаў і сумесна вызначыць парадак будаўніцтва бензінавозаў на заводах рачсудаверфі, так і ў майстэрнях — аб'яднаньнях рэчнага транспарту. У месячны тэрмін павінны быць вызначаны заводы на якіх можа быць разгорнута будаўніцтва тэхнічнага рачнага флёту. На працягу 1931 году павінна быць скончаны пераход на гаспадарчы разьлік усіх суднарамонтных майстэрняў 1-га і 2-га разраду. Важнейшыя заводы і майстэрні, затоны павінны быць аб'яднаны ў самастойныя гаспадарчыя аб'яднаньні па рамонту суднаў. За сваечасовае выкананьне пляну суднабудаўніцтва і рамонту павінны несьці пэрсанальную адказнасьць начальнікі затонаў і адміністрацыі заводаў.

З мэтаю ўзмацненьня тэмпу мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ на водным транспорце Наркомвод абавязваецца разгарнуць ва ўласных майстэрнях выраб прасьцейшых сродкаў механізацыі і распрацаваць конкрэтны плян правядзеньня мэханізацыі пагрузачна разгрузачных работ на водным транспорце.

У сувязі з тым, што суднаходныя рэкі, у тым ліку такія важнейшыя артэрыі, як Волга і Днепр, надзвычай запушчаны, што стварае пагрозу нормальнаму суднаходзтву, СПА павінен разглядзець пытаньне аб сыстэматычным упарадкаваньні суднаходных рэк. Мясцовыя выканкомы абавязуюцца прыняць мэры па ачышчэньню мясцовых рэк і забясьпечаньню нормальных лясных сплаваў.

Да 1 сакавіка для паўднёвых раёнаў і да 15 сакавіка для паўночных раёнаў павінны быць распрацаваны і паведамлены па месцы цьвёрдыя пляны перавозак у навігацыю 1931 году. Пры гэтым павінна быць устаноўлена матар'яльная і судовая адказнасьць кліентуры за непрадастаўленьне грузаў у вызначаныя плянам тэрміны, і такая-ж адказнасьць воднага транспорту за неподачу тонажу і цягі.

Організацыйная структура рэчнага транспорту карэнным чынам зьмяняецца. Судно, як першапачатковая гаспадарчая адзінка, прыраўноўваецца да прадпрыемства. павінна працаваць на аснове гаспадарчага разьліку і мець цьвёрды промфінплян.

Організуецца каля 50 раённых кіраўніцтваў рэчнага флёту. Замест існуючых 23-х дзяржпараходзтваў ствараюцца наступныя 15 параходзтваў: волскае, маскоўска-окскае, камскае, дняпроўскае, днепрадзьвінскае, паўночна-заходняе, паўночнае, дона-кубанскае, закаўкаскае, сярэдня-азіяцкае, заходня-сібірскае, енісейскае, усходня-сібірскае, ленскае і амурскае. Акрамя таго, на раёне Урал ствараецца раённае кіраўніцтва, падпарадкаванае непасрэдна Наркомводу. Існуючыя агенцтвы дзяржпараходзтваў ліквідуюцца.

У мэтах паляпшэньня работы каманднага складу параходаў, замацаваньня кваліфікаваных кадраў рабочага і каманднага складу на рачным транспорце і павышэньня прадукцыйнасьці іх працы, Наркомвод разам з ЦК воднікаў абавязваецца ў месячны тэрмін распрацаваць новую сыстэму зарплаты працаўнікоў рачнага транспорту, звязаўшы з павышэньнем якасьці працы. Дадаткова да тарыфнай аплаты ўстанаўліваецца надбаўка за выслугу для капітанаў і механікаў, памочнікаў капітанаў і механікаў, старшых лоцманаў, рулявых, масьленшчыкаў і качагараў, прычым для апошніх яшчэ ўстанаўліваецца прэміяльная за эканомію апалу.

Да 1-га сакавіка бягучага году павінна быць створана водная кооперацыя па структуры, устаноўленай для кооперацыі рабочых-чыгуначнікаў. Наркомсьнабу і Цэнтрасаюзу даручаецца організаваць закрытыя размеркавальнікі ў найбольш буйных затонах і водных басэйнах, рэгулярна забясьпечваючы іх па ўстаноўленых нормах.

Адзначаючы, што партарганізацыі рэчнага транспорту зьвялі ўвагу больш адсталым у пастаноўцы партыйнай і масава-выхаваўчай работы у рэйдавых і іншых водных ..., ЦК УсеКП(б) і СНК прапануюць мясцовым партыйным і комсамольскім організацыям цэнтр увагі ўсёй работы згуртаваць на рашучай барацьбе з прагуламі, рвацтвам, за ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны, апіраючыся на перадавыя колы рабочых воднага транспорту, на ўдарнікаў.

# Організаваны колгас імя газэты „Рабселькор"

## Прыклад ударнай работы сялюцкіх селькораў—прыклад усім селькорам Беларусі

Мы, селькоры Сялюцкай школы колгаснае моладзі, Караліскага раёну, організаваліся ва ўдарныя брыгады, шырока разгарнулі работу сярод вакольнай беднаты і сераднякоў. 1-га лютага наша ўдарная рабселькораўская брыгада, з дапамогай асьветнікаў Караліскага раёну, організавала ў вёсцы Палоўкі колгас імя газэты „Рабселькор".

Мы бярэм на сябе абавязак уцягнуць у гэты колгас усю вакольную бядняцка-серадняцкую масу сялянства. Кожны выхадны дзень мы будзем скарыстоўваць для практычнай работы ў колгасе. Бярэм на сябе абавязак разгарнуць работу нізавога друку-насьценных газэт і ўзмацніць распаўсюджваньне газэты „Рабселькор" сярод селькораў Караліскага раёну. Мы ставім задачай на першы час завербаваць 50 падпісчыкаў на „Рабселькор".

Заклікаем усе школы колгаснай моладзі і ўсіх селькораў, якія там вучацца, пасьледваць нашаму прыкладу.

Ударная рабселькораўская брыгада: Навіцкі А., Рублеўскі Н., Прыходзька М., Маўшыка У., Кашавод А., Шчарбенка А., Жукоўскі Я., Дубровін С., Дарожка Н., Буденка Б., Мішук Я., Радзевіч Р. Назарчык А.

# УДАРЫЦЬ ПА ОПОРТУНІСТЫХ, ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ПАРТЫІ

## Комсамол Старых Дарог, ліквідуй на хаду прарывы!

### Ні на адзін га не дазволіць скараціць пасеўплошчу


## СЫГНАЛЫ З СТАРЫХ-ДАРОГ

*(Ад нашага спэцкора)*

Стара-Дароскі раён нездавальняюча рыхтуецца да вясеньняй пасеўкампаніі. Сельсаветы, партыйныя і комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць.

Колектывізацыя раёну праходзіць зусім нездавальняюча. У раёне 39 колгасаў з плошчай у 6555 га, яднаюць толькі 755 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Па пляну пасеўкампаніі да пачатку сяўбы ў раёне павінна быць 30 проц. колектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на 1-I меркавалася мець 20 проц. колектывізацыі, але дзякуючы права-опортуністычнай практыцы Райвыканкому, Райколгассаюзу і раду сельсаветаў прыліву ў колгасы няма.

Масава-організацыйная работа па організацыі новага прыліву не праводзіцца. Організаваныя раней 11 ініцыятыўных груп развальіліся. Зусім не вядзецца праца па замацаваньню існуючых колгасаў. Па раду колгасаў, „Новае Жыцьцё" і інш., дрэнная працоўная дысцыпліна, няма работы па організацыі працы ў колгасах, не разгорнута соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, як асноўныя мэтоды працы, рад колгасаў засьмечаны клясава-варожымі элемэнтамі.




Закілзаныя кулаком

Па колгасах яшчэ да гэтага часу не праведзена размеркаваньне ўраджаю. З 39 колгасаў раёну толькі ў 3-х размеркаваны прыбытак.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія кіруючых органаў колгасаў праходзіць нездавальняюча, масы колгасьнікаў не мобілізаваны на актыўны ўдзел. Перавыбарчая кампанія не падначалена задачам організацыі новага прыліву ў колгасы, падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, ачысткі колгасаў ад кулацкіх элемэнтаў, а кіраўніцтва колгасаў ад опортуністых. Райколгассаюз ня кіруе работай колгасаў.

Сельсаветы раёну яшчэ ня сталі на чале колгаснага руху, не павярнуліся тварам да колгаснага будаўніцтва. Кіраўнікі Крываносаўскага сельсавету лічаць, што ня справа сельсавету дапамагаць колгасу організаваць працу, і не вядуць работы з беднатой і батрацтвам. У Языльскім сельсавеце ўжо на працягу 3-х месяцаў не праводзіцца ніякай работы з беднатой.

### Выканалі заказ кулака

Пляны вясеньняй пасеўкампаніі не даведзены да колгасаў і вёсак. Ня выконваюцца ўрадавыя заданьні ва ўстаноўленыя тэрміны.

Па пляну НКЗБ пасеўная плошча па раёну павінна быць даведзена ў гэтую вясеньнюю пасеўкампанію да 29.934 га, альбо пашырана на 18 проц. Аднак, правыя опортуністыя з Райколгассаюзу, Райзямаддзелу і РВК плян НКЗБ скарацілі на 4089 га. Скарочаны опортуністымі плян даведзены да сельсавету, а сельсавет, у сваю чаргу, пачаў яго скарачаць. Толькі на раённым зьезьдзе саветаў была выяўлена гэта права-опортуністычная практыка РВК і сельсаветаў і дан рашучы адпор.

Аднак, і зараз няма патрэбнага пералому. Рад сельсаветаў не выпраўляюць сваёй опортуністычнай практыкі. Райзямчастка ня прыняла рашучых захадаў, каб тэрмінова правесьці ў жыцьцё дзяржаўнае заданьне па пашырэньню пасеўплошчы. Пасобныя працаўнікі з кіраўніцтва Райзямчасткі і Райколгассаюзу енчаць аб тым, што няма плошчы, за лік якое магчыма зрабіць пашырэньне.

Вялікая плошча пахаці для ярового пасеву павінна быць пашырана за кошт мэліорацыі балот, выкарчовак і ўзоркі аблогі.

У раёне яшчэ ў 1930 годзе былі організаваны мэліорацыйныя таварыствы: Шаткаўскае — з плошчы 55.440 га, якое асушыла ў мінулым годзе толькі 720 га. Пядарэцкае павінна было асушыць 160 га, а выканала плян толькі на 20 проц. Таксама і сёлета ў шэрагу колгасаў, „Май", „Прогрэс" і інш., павінны быць організаваны мэліорацыйныя таварыствы, але райземчастка і Райколгассаюз ня кіруюць гэтай працай. У вынік вялікая плошча, за кошт якое павінна быць пашырана пасеўплошча, знаходзіцца пад балотамі.

### Заданьні ўраду ня выкананы

Не выконваецца ў раёне плян організацыі насенных фондаў. Па колгасах ссыпана насеннага фонду толькі 1571 цэнтнэр збожжа і бульбы 8345, страхавых фондаў—296,2 цэнт. Плян ссыпкі насеньня і страхавых фондаў выкананы толькі на 18-20 проц. замест 75 проц на 1-II—31 г.

Ачыстка насеньня таксама праходзіць нездавальняюча. Зерняачышчальныя машыны не нагружаны працай. З патрэбных 2410 тон ачышчаны зусім нязначны процант.

Дрэнна рамантуецца сельска-гаспадарчы інвэнтар. Меркавалі організаваць кузьні, але толькі меркавалі. На складах райколгассаюзу ляжаць сельска-гаспадарчыя машыны, так патрэбныя для вясеньняй пасеўкампаніі, але чамусьці Райколгассаюз не накіроўвае іх па колгасах.

Усе вышэйпералічаныя факты права-опортуністычнай практыкі райколгассаюзу райземчасткі, РВК, іх бязьдзейнасьць у колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі спрыялі таму, што ў раёне, замест новага прыліву ў колгасы, маецца адлі...

Пастановы саюзнага ўраду і ўраду БССР аб контрактацыі яравых пасеваў у 1931 годзе, яшчэ да гэтага часу не популярызаваны сярод мас колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну. Райвыканком і Райколгассаюз ня вызначылі пляны контрактацыі, не давялі заданьняў контракта... да сельсаветаў, ровам як і колгасаў раёну.

### Правая практыка у працы комсамолу

Удзел комсамольскай організацыі ў колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі нездавальняючы. Райком і ячэйкі ў гэтай ...ьнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі праводзяць права-опортуністычную практыку. Колгасныя ячэйкі ... прымаюць ніякага ўдзелу ў організацыі працы колгасу, разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва, у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі. Не праводзіцца ніякай работы з беднатою і батрацтвам. Ні адна з комсамольскіх ячэек ні намеціла сабе пляну конкрэтных заданьняў на падрыхтоўку да вясеньняй пасеўкампаніі, каб выканаць заданьні партыі аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі і конкрэтацыі яравых пасеваў.

### Па-бальшавіцку выправіць прарывы

Сыгналы аб права-опортуністычнай практыцы раду раённых організацый і сельсаветаў і падаваныя раней цэнтральным друку („Зьвязда" і інш.) раённымі організацыямі ня ўлічаны. Пагроза зрыву дырэктыў партыі па колектывізацыі і правядзеньню вясеньняй пасеўкампаніі неліквідавана. Раённы камітэт партыі і комсамолу павінны прыняць рашучыя захады, выправіць клясавую лінію ў працы раённых організацый і сельсаветаў, забясьпечыць актыўны ўдзел шырокіх мас партыйцаў, комсамольцаў, колгасьнікаў, беднякоў і серадняцкоў аднаасобнікаў у разгортваньні колгаснага руху і падрыхтоўцы да вясеньне-пасеўнай кампаніі. Шырока разгарнуць работу сярод беднаты і батрацтва, нанесьці руйнуючы ўдар па кулацтву і яго агентах—правых опортуністых. Прыцягнуць да адказнасьці тых, хто насьмеў скарачаць урадавае заданьне па пашырэньню пасеўнай плошчы.

А. Заслаўскі

### Падрыхтоўка да сяўбы — нездавальняючая

ЧЭРВЕНЬ, 11 (Па тэлефону ад нашага юнкора).—Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы па раёне праходзіць нездавальняюча. Раённыя організацыі ня ведаюць, як праходзіць стварэньне насенных фондаў. Пляны вясеньняй сяўбы далей сельсаветаў не пашлі. Бядняцка-серадняцкая частка вёскі ня ведае аб кантрольных лічбах пасеўплошчы.

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР адносна контрактацыі яшчэ зусім не прапрацавана РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ.

У раёне 45 колгасаў, а умовы з трактарнай станцыяй ня склаў ніводзін.

Распаўсюджваньне трактарных акцый ідзе нездавальняюча. Усяго прадана акцый на 2570 рублёў, што складае вельмі мізэрны процант заданьня.

У раёне, па прыблізных падліках, не хапае 310 тон корму для жывёлы колгасаў і саўгасаў, а райколгассаюз гэтаму надзвычайна важнаму пытаньню не аддае належнае ўвагі.

Комсамольская організацыя раёну ў сучасны момант у галіне кампаніі бязьдзейнічае.

Міхась Ракіта

### Падцягнуць адстаючы...

У Клічаўскім раёне падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі ... поўным разгары. Гэта пытаньне абгаворана на ўсіх партыйных, комсамольскіх ячэйках і сярод грамадзкіх організацый. Шырока разгорнута масавая работа па організацыі новага прыліву ў колгасы. У вёсцы Маркаўшчына, Клічаўскага сельсавету, пры абгаварэньні пляну вясеньняй сяўбы, бядняцка-серадняцкая частка вёскі з'організавалася ў колгас і абавязалася выканаць і перавыканаць кантрольныя лічбы на сяўбе. Пры дапамозе вучняў школы ШКМ гэты колгас распачаў ударную работу па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі.

Вучні Клічаўскай школы ШКМ разьбіліся на брыгады і накіраваліся ў колгасы і вёскі, каб абгаварыць пляны вясеньняй пасеўкампаніі і давесьці іх да колгасаў вёсак і кожнага двара.

Аднак, ня ўсе яшчэ комсамольскія ячэйкі раёну па-ўдарнаму рыхтуюцца да вясеньняй пасеўкампаніі. Райком комсамолу павінен шырока распаўсюдзіць на ўсю організацыю ... вопыт ... ячэек з тым, каб уся комсамольская організацыя па-ўдарнаму ўключылася ў разгортваньне работы па організацыі колгаснага прыліву і падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Пост „Ч. З." С. Стальны

# УКЛЮЧЫЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ У СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ КОНВЭЕР ЯКАСЬЦІ

## ГОМЕЛЬСКАЯ ФАБРЫКА „ПРАЦА", МЕНСКАЯ ШОРНАЯ ФАБРЫКА І ЧЫГУНАЧНЫ ВУЗЕЛ УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНВЭЕР ЯКАСЬЦІ

## Ператварыць конвэер якасьці ва ўсесаюзны паход працоўнай моладзі за палепшаньне якасьці продукцыі

## Слухай, комсамолія Украіны!

### Адкрыты ліст да комсамольцаў скураной прамысловасьці Украіны. Газэце „Комсамолец Украіны"

**Дарагія таварышы!**

Вялікія задачы, пастаўленыя перад пролетарыятам Савецкага Саюзу ў справе выкананьня плянаў рашаючага, 3-га году пяцігодкі. Па контрольных лічбах гэтага году наша прамысловасьць павінна ўзрасьці на 45 проц. Гэта значыць, што ў гэтым, рашаючым годзе, росту нашай прамысловасьці павінны быць надамі нябачаныя ў гісторыі тэмпы, тэмпы, якія магчымы толькі ў краіне саветаў, тэмпы пасільныя толькі для рабочае клясы пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі. Адначасова з гэтым паўстае пытаньне аб якасьці. Выкананьне якасных паказчыкаў адстае ад выкананьня колькасных паказчыкаў. Якасьць продукцыі і барацьба за зьніжэньне сабекошту не знашлі сабе яшчэ належнага месца ў сыстэме нашай барацьбы за промфінплян.

З мэтай лепш організаваць барацьбу за якасьць, комсамольцы Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта і рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" высунулі прапанову стварыць скразны конвэер якасьці. Гэта прапанова, падтрыманая амаль усімі прадпрыемствамі гарбарнай прамысловасьці, атрымала шырокі водгук сярод працоўных Савецкай Беларусі.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне ідэй конвэеру немагчыма толькі ва ўмовах Савецкай Беларусі, бо рад нашых прадпрыемстваў у значнай ступені залежыць ад прадпрыемстваў Украіны, якія знаходзяцца ў Бердычаве і г. д.

Мы зьвяртаемся да вас з заклікам уключыцца ў гэты конвэер з тым, каб прадпрыемствы Савецкай Украіны, што забясьпечваюць нас паўфабрыкатамі, забясьпечылі-б пачынаючы ад ніжэйшага да вышэйшага працэсу вытворчасьці, найлепшую якасьць продукцыі. Мы чакаем ад „Комсамолец Украіны" уключыцца ў конвэер, каб мобілізаваць усёй працоўнай моладзі, рабочых гарбарнай вытворчасьці, у прыватнасьці Украіны, на барацьбу за якасьць продукцыі, ператварыць конвэер ва ўсесаюзны паход рабочай моладзі на чале з комсамолам, пры актыўным удзеле ўсёй працоўнай грамадзкасьці, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, гэта будзе конкрэтнае мерапрыемства, якое … быць зьдзейсьнены ў асноўным комсамолам паварот тварам да задач гаспадарчага будаўніцтва.

Чакаем вашага адказу і спадзяемся, што наш выклік вы прымеце і акладна разгорнеце працу ў гэтым напрамку.

З комсамольскім прывітаньнем

Рэдакцыя газэты ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена"

## Перакінуць на мэталюргічную прамысловасьць і будаўніцтва

**Рэзолюцыя нарады экономработнікаў па пытаньню аб стварэньні соцыялістычнага конвэеру якасьці**

— Нарада ўхваляе каштоўную ініцыятыву комсамольскага колектыву Віцебскай абутковай фабрыкі Лекерта і газэты „Чырвоная Зьмена" аб організацыі скразнога соцыялістычнага конвэеру якасьці, як конкрэтную форму мобілізацыі … на выкананьне дырэктыў … ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, … IX і X зьезду ЛКСМ і … IX зьезду УсеЛКСМ.

— Нарада ўхваляе рашэньні колектыву фабрыкі „Праца" аб уключэньні ў соцыялістычны конвэер якасьці на гарбарнай прамысловасьці БССР і лічыць неабходным перакінуць гэты вопыт на ўсе галіны прамысловасьці БССР і Гомеля, у прыватнасьці нарада выказваецца за неабходнасьць організацыі скразнога соцыялістычнага конвэеру якасьці па мэталюргічнай прамысловасьці і рэкомэндуе перадаць гэтую справу комсамольскаму колектыву Гомсельмашу.

— Скразны конвэер якасьці, які зьяўляецца вышэйшай формай соц. спаборніцтва, павінен ахапіць сабою ўсе існуючыя формы соц спаборніцтва і ўдарніцтва, як скразныя брыгады, опэрацыйна плянавыя групы, вытворчыя колектывы і г. д. … сабсама выклікаць шэраг іншых … творчай ініцыятывы рабочай масы і рабочай моладзі.

— Адна з галоўнейшых мэт конвэеру — разгортваньне вялізарнай работы на барацьбе за якасьць прадукцыі як на самым прадпрыемстве, так і прадпрыемстве, якое забясьпечвае сыравінай і паўфабрыкатам.

Комсамольскія ячэйкі, організуючы конвэер, павінны прад'явіць соцыялістычны рахунак па якасьці гэтым прадпрыемствам, бяручы на сябе шэраг абавязацельстваў і сочачы за выкананьнем гэтых узаемных дагавароў.

— Пасьпяховая барацьба за якасьць немагчыма без організацыі плянава-опэрацыйнай работы на самім прадпрыемстве. Таму нарада лічыць неабходным, для пасьпяховага правядзеньня конвэеру якасьці,—шырока організаваць плянава-опэрацыйныя групы, якія павінны будуць цесна ўвязвацца з плянавай работай заводу.

У сувязі з тым, што транспорт зьяўляецца неадымнай часткаю кожнай фабрыкі і заводу, нарада выказваецца за неабходнасьць тэрмінова ўключыць у конвэер транспорт.

— Каб лепш падрыхтавацца да будаўнічага сэзону, нарада выказваецца за неабходнасьць організацыі скразнога соцыялістычнага конвэеру якасьці ў будаўнічых організацыях.

— Нарада просіць ГБ ЛКСМБ і газэту „Чырвоная Зьмена" у бліжэйшы час організаваць спэцыяльную рад-пераклічку прадпрыемстваў, якія ўключыліся ў скразны соцыялістычны конвэер з мэтай перадачы лепшага вопыту.

— Для дапамогі колектывам, якія ўключыліся ў праведзеньне конвэеру, неабходна прыцягнуць усіх практыкантаў і студэнтаў, якія знаходзяцца ў Гомелі на практыцы.

## Перакінуць вопыт на іншыя галіны вытворчасьці

**(З пастановы бюро Гаркому)**

1. Ухваляючы ініцыятыву комсамольцаў фабрыкі Лекерта, як конкрэтную форму барацьбы за якасьць, прапанаваць усім ячэйкам гарбарнай прамысловасьці („Бальшавік", абутковая і шорная) безадкладна уключыцца ў скразны соцыялістычны конвэер якасьці.

2. Для лепшай падрыхтоўкі да гэтай працы, ячэйкам і колектывам разгарнуць шырокую масавую работу, для чаго склікаць сходы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі па наступных пытаньнях:

1) Прапрацоўка адкрытага ліста комсамольскага колектыву фабрыкі імя Лекерта аб організацыі скразнога конвэеру якасьці.

2) Даклад гаспадарніка аб становішчы якасьці выпусканай продукцыі (дзе і распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па ўключэньні ў конвэер).

3. Склікаць аб'яднанае паседжаньне бюро колектыву КСМ „Бальшавік", абутковай і шорнай фабрык, дзе вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы па гэтаму пытаньню.

4. Бюро гаркому, падтрымліваючы гэтую ініцыятыву, лічыць неабходным перакінуць гэты вопыт на астатнія галіны вытворчасьці.

## Уключаемся ў конвэер

### Фабрыка „Труд" уключылася ў конвэер якасьці

Дрэнная якасьць продукцыі фабрыкі „Труд", акрамя вялічэзных страт, паніжае рэальную зарплату рабочых. Неабходнасьць палепшыць якасьць выпусканай продукцыі настойліва патрабуе ад організацыі фабрыкі мобілізаваць сілы і сродкі на ліквідацыю прарыву на якасьці.

Дэкада штурму за якасьць дала некаторы зрух у гэтым напрамку, але ўсе-ж вынікі нязначныя (замест

Карта соцыялістычнага конвэеру якасьці

34 проц. першага сорту, выпускаецца 80 проц.)

Улічваючы асаблівую важнасьць барацьбы за якасьць, ухваліць ініцыятыву комсамольцаў Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта і „Чырвонай Зьмены" стварыць усебеларускі конвэер якасьці. Лічыць неабходным уключыцца ў гэты конвэер. Дзеля гэтага, акрамя організацыі работы па палепшаньню якасьці продукцыі, высунуць перад ніжэйпаказанымі фабрыкамі і заводамі, якасьць продукцыі каторых цесна ўвязана з выпусканай намі продукцыяй, наступныя патрабаваньні:

1. Магілеўскі завод: а) верхні крой—халявы і паўборты—павінен быць па выпрацоўцы добрай якасьці (без асадкі, лішняе таўшчы і добра выдублены), б) халявы і перады павінны строга адпавядаць модэлям і выразна абкроены, г) адпраўляемы для фабрыкі верхні крой павінен адпавядаць нормам Т-У, д) адгрузка паўфабрыкату павінна адбывацца бесьперапынна.

2. Віцебскі скурзавод: а) адпраўляемы палувал для нашай фабрыкі павінен адпавядаць цяжка-ялаваму боту, б) недадублены палувал значна пагоршвае якасьць нашай продукцыі, у сувязі з гэтым мы патрабуем добраякаснага палувалу, в) палувал павінен адпраўляцца штодзённа і бесьперабойна.

3. Вяцкі драўляна-цьвіковы завод: а) выпрацоўваемую драўляную істужку, якая адпраўляецца нам па нарадах „Саюзскуры", выраблялць добрай якасьці. Істужка павінна быць з добрага дрэва і не касою. Падобныя дэфэкты прыводзяць да таго, што драўляна-шпілечныя машыны псуюцца.

Мы зварочваемся да партыйных, комсамольскіх і профорганізацый адзначаных фабрык і заводаў—прыняць усе залежныя ад іх захады для выкананьня прад'яўленых намі зацатрабаваньняў.

Лічыць неабходным стварыць конвэер якасьці ўнутры фабрыкі, для чаго правесьці наступныя мерапрыемствы: а) усе паўфабрыкаты, якія прыбываюць на фабрыку, павінны падлягаць строгай праверцы перад тым, як яны нападаюць у цэх; б) закройны цэх перадае швейнаму цэху паўфабрыкат у строгай суадпаведнасьці з разнарадкай адсортаванай як па сортнасьці, так і па якасьці выконваемых процэсаў. У выпадку падачы дрэннай якасьці тавару, ён павінен быць зьвернуты на склад.

Швейны цэх, які прымае работу ад закройнага цэху, павінен строга правяраць яе як па якасьці, так і па камплектах.

За ўсю адзначаную працу ўцягнуць мантажны цэх, усклаўшы на яго адказнасьць за своечасовы рамонт машын і падрыхтоўку запасных частак да іх.

Партколектыў, колектыў ЛКСМБ і фабком фабрыкі „Труд"

## СЭМАФОР АДЧЫНЕНЫ

### Колектыў ЛКСМБ ўключыўся ў конвэер якасьці.

**(Пастанова бюро колектыву ЛКСМБ Менскага вузла МББ чыгункі)**

Чыгуначны транспорт „вузкае" месца ва ўсёй барацьбе за пасьпяховае выкананьне лёзунгу партыі „Пяцігодку у 4 гады". Ад выразнай і плянавай працы транспорту залежыць плянамерная праца іншых галін прамысловасьці. З гэтай мэтай комсамольскі колектыў, падхопліваючы ініцыятыву комсамольцаў Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта, уключаецца ў соцыялістычны конвэер якасьці, каб забясьпечыць своечасовую дастаўку ўсіх паўфабрыкатаў, неабходных гарбарнай прамысловасьці, а так сама і ўсе перавозкі.

Колектыў бярэ на сябе наступныя абавязкі:

* Стварыць опэрацыйны штаб з 5 асоб, якім даручыць:

— сачыць за своечасовым адпраўленьнем цягнікоў;

— за своечасовай падачай к месцу выгрузкі і пагрузкі;

— за своечасовай вывазкай грузаў з тэрыторыі станцыі;

— выяўляць прычыны спазьненьня цягнікоў і конкрэтных вінавайцаў і выкрываць іх праз друк, у прыватнасьці праз „Чырвоную Зьмену".

* Опэрацыйнаму штабу шырока мобілізаваць комсамольскія масы і беспартыйную моладзь, прыцягнуўшы групы „лёгкай кавалерыі", для штодзённае працы па конвэеру і ўважлівага нагляду за ходам жыцьця станцыі. Аб ўсіх недахопах даводзіць да ведама колектыву ЛКСМБ.

* Каб пасьпяхова выканаць узятыя на сябе абавязкі, комсамольскі колектыў лічыць неабходным выклікаць для ўключэньня ў конвэер чыгуначныя організацыі ЛКСМБ станцыі Ворша, Віцебск, Магілёў, Жлобін і Менскую ячэйку Саюзтрансу, бо нормальная праца Менскага вузла залежыць ад працы вышэйпералічаных організацый.

Комсамольскі колектыў лічыць, што профсаюзныя і партыйныя організацыі павінны ўключыцца ў конвэер для сумеснай і пасьпяховай барацьбы за палепшаньне работы транспорту і якасьці продукцыі.

Бюро колектыву

## Шорная ў паходзе

Выпусканая Менскай шорнай фабрыкай „Усход" продукцыя да гэтага часу была надзвычайна нізкай якасьці.

Зараз калі па ўсім Савецкім Саюзе праводзіцца паход па барацьбе за якасьць, калі па выклік комсамолцаў Віцебску разгортваецца праца па соцыялістычнаму конвэеру якасьці, наша фабрыка таксама зрабіла вялікі крок уперад. На фабрыцы абвешчан месячны паход па барацьбе за якасьць. К канцу паходу брак павінен быць зьнішчаны.

Праведзены мітынг па пытаньню аб барацьбе з бракам ускалыхнуў усіх рабочых фабрыкі. Працуе паказальны вытворчы суд над тымі рабочымі, якія систэматычна даюць брак. Наладжаны соцыялістычны конвэер якасьці паміж цэхамі і рабочымі: кожны рабочы адказны за працу, зробленую папярэднім таварышом.

Ударныя брыгады ўсю сваю ўвагу зьвяртаюць на зьніжэньне браку, на лепшую якасьць выпусканай продукцыі, шляхам узаемнага выкліку на соц. спаборніцтва.

Комсамольская ячэйка вылучыла брыгады па праверцы выкананьня соц. дагавору, палепшаньню якасьці продукцыі і зьніжэньню браку. Цэх, або брыгада, якая больш пасьпяхова праводзе ў жыцьцё гэтую працу, атрымае чырвоны пераходны сьцяг.

Комсамольскі пост „Чырвонай Зьмены" будзе акуратна асьвятляць у газэце „Ч-З" ход месячніку і конвэеру.

Пост „Ч. З."—БАЦЬВІНІК

# ІХ ЯШЧЭ НЕ ЗАКРАНУЎ 2-ДЭКАДНІК ШТУРМУ

## Чэрвеньская, Тураўская і Смалявіцкая райорганізацыі ЛКСМБ у хвасьце ільназагатовак

### Комсамол Чэрвеньшчыны ня ўключыўся ў правядзеньне ільназагатовак

ЧЭРВЕНЬ 11 (па тэлефону ад нашага юнкора).—Чэрвеньскія раённыя і сельскія організацыі не мобілізаваліся на выкананьне пляну ільназагатовак. Да гэтага часу не мобілізаваны шырокія колы колгасных і бядняцка-серадняцкіх мас на правядзеньне нарыхтовак, рашучае наступленьне на кулака, да якога па раду сельсаветаў не давездзена цьвёрдае заданьне.

Замест таго, каб у студзені ліквідаваць прэрыў папярэдніх месяцаў і паказаць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы, на 5-II заданьне па ільнавалакну выканана толькі на 35,5 проц.

Зусім адстае аднаасобны сэктар, які на 5-II выканаў свае заданьне толькі на 39 проц.

Кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі цьвёрдыя заданьні толькі па ільна-валакну на 39 проц, і насеньню на 51 проц.

Комсамол Чэрвеньшчыны ня прымае ніякага ўдзелу у загатоўках лёну. РК ЛКСМБ гэтага пытаньня яшчэ не абгаварваў і не мобілізаваў організацыю.

Неабходна зрабіць круты пералом даўшы конкрэтныя заданьні ячэйкам. Рашуча паставіць пытаньне аб спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулака.

Міхас Ракіта

### Стаўка на самацёк зрывае ільназагатоўкі

ТУРАЎ, 11 (Па тэлеграфу ад нашага юнкора)—ільназагатоўкі па Тураўскім раёнэ праходзяць з лачынна марудна. Плян выкананы толькі на 25 проц. Усе організацыі спадзяюцца на самацёк. Райком комсамолу нават не абгаварыў гэтага пытаньня. Ячэйкі комсамолу таксама стаяць у баку ад загатовак.

Сухоцкі

### Прывесьці ў рух мёртвы капітал

У колгасе „Колас" Чарэйскага раёну (Аршаншчына) ляжаць без патрэбы пянька і лён з 26 [illegible]а., не скарыстоўваюцца колгасам і нікуды не адпраўляюцца.

З колгасу невядома куды зьнікла 200 пудоў канапель.

Трэба зараз-жа пяньку і лён пусьціць у ход і заняцца праверкай становішча колгасу, каб пакласьці канец такім недапушчальным зьявам.

Пост „ЧЗ"—Мік. Малей

### Ня ўключыліся

СМАЛЯВІЧЫ, 11 (Па тэлефону ад нашага юнкора)—Комсамольская організацыя раёну па сёньнешні дзень ня ўключылася ў ліквідацыю прарыву, які маецца на загатоўках ільна і пянькі. Райком комсамолу не абгаварыў гэтага пытаньня на бюро і ня даў ніякіх дырэктыў ячэйкам.

Арцельны

*На ўсебеларускім зьезьдзе Асоавіяхіму*

### Перабудаваць работу Асоавіяхіму ў суадпаведнасьці з міжнародным і ўнутраным становішчам

Пазаўчора ў Менску адчыніўся другі ўсебеларускі зьезд Асоавіяхіму. Зьезд адчыніў старшыня Цэнтральнага Савету—тав. Галадзед. У склад прэзыдыуму абраны 23 асобы: Галадзед, Шарангові ч, Маліноўскі (ЦС. Асоавіяхіму СССР), Дрылёнак, Гузікаў і інш.

Пад бурныя воплескі абіраецца ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. Сталіна, Молатава, Варашылава, Калініна, Гея, Уншліхта, Тэльмана, Ленскага, Косарава і Максіма Горкага.

Зьезд заслухаў прывітаньне ад Менгарорганізацыі Асоавіяхіму, якая паднесла ў падарунак зьезду бюст Леніна, ад АБВШ і Авіяхэмтрадаў імя Блюхера і друкароў.

За актыўную дзейнасьць у рабоце Асоавіяхіму зьезд узнагародзіў тав. Дрылёнка значком актывістага.

На вячэрнім пасяджэньні зьезду быў заслуханы даклад тав. Маліноўскага аб дзейнасьці ЦС Авіяхіму СССР.

Учора зьезд заслухаў справаздачу тав. Дрылёнка аб рабоце Беларускай арганізацыі Асоавіяхіму.

— Кароткі агляд становішча і дзейнасьць арганізацыі Асоавіяхіму БССР,—гаворыць тав. Дрылёнак,—паказвае што таварыства за справаздачны пэрыод дабілася значных дасягненьняў, як у садзейнічаньні ўмацаваньню абароны, так і ў сацыялістычным будаўніцтве.

Асоавіяхім налічвае зараз да 7 мільёнаў членаў, у тым ліку наша Беларуская арганізацыя—300 тысяч чалавек.

Значныя дасягненьні маюцца і ў галіне ўздыму ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі, правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній, пратручваньня і ачысткі насеньня, арганізацыі чырвоных абозаў на збору лому і ўтыльсыравіны, збору збожжа ў фонд абароны, барацьбы з забойствам коняй і раду іншых мерапрыемстваў. Але тавариства нашай рэспублікі ні ў якім разе не можа здаволіцца гэтымі дасягненьнямі. Сучасны пэрыод будаўніцтва, клясавая барацьба, пасыленьне росту социялістычнага сэктару вёскі, мэтады соц.спаборніцтва—усё гэта выклікае неабходнасьць рашучага ўздыму грамадзкасьці, масавасьці, якасьці, пачуцьця адказнасьці і дысцыпліны ва ўсіх галінах работы.

Конфэрэнцыя рабочай моладзі гор. Менску

**ПЕРАНОСІЦЦА НА 26 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ.**

Менгарком ЛКСМБ.

# Па эклектыках і шовіністых у музыцы—руйнуючы ўд[ар]

Адносіны „фундаманту" да другіх народаў:

Род яўрэйскі засмучоны,
Ён ад хрыста адлучоны,
І раздзіўся жыдове раду
Як прызьвесьці хрыста на здраду...

(М. Гарэцкі і Ягораў „Народн. песьні з мэлёдыямі", стар. 155).

Два дансия казкі.
Да прывезьлі Хайку,
Да на мост высокі:
„Жыдовачка Хайка,
Ці ў Дунаі ўтапіся
Ці дамоў вярніся".

(Рамзнаў „Зборнік беларускіх народных песень", стар. 33)

Каб зрабіць ацэнку значэньня гэтага „фундаманту" для пролетарскай музыкі давоні будзе і паданы вытрымкі, на кажучы ўжо аб „Лявоніхе", „Зязюльцы" і іншых, бо прышлося-б перадрукаваць усю нацдэмаўскую лі-[illegible] сьпеўнікі.

Пролетарская музыка ставіць дзіця Кастрычніка, а не „надбудова" на „дарэвалюцыйныя і фундаманце". Пролетарская музыка нічога супольнага мае з тэю музыкай, вытрымкі з якое вышэй і ніжэй пададзены. Такая музыка ёсьць музыка фэўдальная, або буржуазная, або царыская, якую Дрэйзін рэстаўруе ў савецкіх умовах. Карацей кажучы: па думцы Дрэйзіна пролетарыят робіць „адраджэньне" дарэволюцыйнай песьні, як гэта і паказана ніжэй:

... Адраджэньня зара
Над народам блісьне,
І з балючых грудзей
Беларускіх дзяцей
Над табой загудзе
Песьня вольных людзей.

(Равенскі „Зборнік песень" стар. 15).

Хто-ж прынясе „адраджэньне беларускаму народу" і як яно будзе выглядаць?

Прагнаў Ясь наш ворагаў (каго трэба разумець пад ворагам толькі вядома аднаму Мацісону)
З беларускіх Нёмнавых берагоў...
Ен жа ў роднай хатанцы гаспалар.
Цяпер Ясь наш арэ свой шнурок
Мае сваю жоначку, свой куток.

(Мацісон „Сьпеўнік для дзіцячых хораў", стар. 30),

Уласная хацінка, уласны шнурочак зямелькі, а можа і хутарочак. І мяшчанскі сямейны дабрабыт з аўтаноміяй для Беларусі ў складзе якой-небудзь суседняй буржуазнай дзяржавы,—такая пэрспэктыва нацыянал-дэмократычнага адраджэньня пасьля перамогі.

Як у прыведзеных песьнях, так і ў іншых, якія зьмешчаны ў адзначаных „сьпеўніках", на першае месца ставіцца нацыянальнае пытаньне. Нацдэмаўскім музыкам нацыянальную леру падавай у першую чаргу. Перамогу над панамі і капіталістымі (апошніх) нацдэмы не прызнаюць на Беларусі) прынёс Ясь, яна „прышла ад сахі". Так аўтары слоў і гармонізацыі перакручваюць гістарычныя факты і адмаўляюць, што перамога працоўных над эксплёататарамі ўтварылася пад гегемоніяй пролетарыяту, як адзінай і пасьлядоўна рэволюцыйнай клясы ня толькі ў вырашэньні буржуазна-дэмократычных проблем у рэволюцыі, але і ў ператварэньні гэтай рэволюцыі ў соцыялістычную. Гэта—тонкае і сьвядомае ўмаленьне нацдэмамі пры дапамозе музыкі ролі пролетарыяту і яго партыі ў Кастрычнікавай рэволюцыі на Беларусі.

Калі прагледзець усе „сьпеўнікі" для хораў, школ, дзіцячых садоў, чырвонаармейскія і народныя песьні, то кожная песьня вытручвае клясавую сьвядомасьць, і інтэрнацыяналізм, а на першае месца высоўваецца вузкая провінцыяльная абмежаванасьць і „братэрства".

Я хлапец малады,
Я дзяцюк хоць куды
І бяз меры я дуж,
Зваць мяне беларус.
Эх, як стане у рад
Малайцоў гэткіх шмат,
Усе вольны яны—
Беларусі сыны..
Скрозь імчыцца, як страла,
Беларусі хвала

(Мацісон, „Сьпеўнік", стар. 21)

Яшчэ:

Беларуская зямліца
Мяне ўзгадавала,
Маці ў мове беларускай
Песьні мне сьпявала.
Гэта слова і край родны
Над усё мне мілы,
Не магу іх адчурацца
Да самай магілы...

(Мацісон, „Сьпеўнік", стар 45)

Нацыянал-дэмакратычны Мальбрук у паход сабраўся і склаў „Ваяўніцкі марш" мусіць для „войска" Б. Балаховіча. Бяз усякай шкоды для сябе кулак і нэпман могуць пад яго маршыраваць:

Мы выйдзем шчыльнымі радамі на родны, вольны свой прастор.
Хай ажыве закамянелы наш беларускі родны дух;

(падкрэсьлена С. В.)

(Тэраўскі „Вайсковы сьпеўнік", стар. 26 і Мацісон „Сьпеўнік". стар. 6-7).

За што-ж ваяваць кліча „усіх да аднаго" аўтар гармонізацыі? За:

Царства праўды і свабоды.
Чуй-жа, браце, беларус,—
Беларусь ў адно мы злучым,
Зажывём аднэй сям'ёй (?! С. В.)

(Тэраўскі, „Вайсковы „сьпеўнік", стар. 7)

Далей:

Злучым Усход і Захад у адну зямлю,
Беларусь усю мы злучым у адну сям'ю.

Яшчэ:

А як панства мы заваюем,

(там-жа стар. 13)

Дык тады ўжо пасьвяткуем.

(там-жа, стар. 17)

Пролетарыят змагаецца за пабудову соцыялізму, за ліквідацыю кулацтва, за зьнішчэньне клясы наогул, за пролетарскі інтэрнацыянальны колектыў, а не за нацыянальную бяскласавую „сям'ю". Наша Чырвоная армія—весны вартавы кастрычнікаўскіх заваёў пралетарыяту.

Аўтар-жа пададзенай музыкі агітуе за кулацкую праўду, роўнасьць і свабоду, за адну нацыянальную сям'ю, ды інакш яно і быць ня можа, бо „беларускія нацыянал-опортуністыя (родныя браты нацдэмаў С. В.), выходзячы в тэорыі адзінай працоўнай беларускай нацыі, лічаць клясавую барацьбу „непаразуменьнем" (К. Гей)

„У будаўніцтве мірным—будаўніцтва". (цікава, дзе гэта аўтар назіраў мірнае соцыялістычнае будаўніцтва?)

(Мацісон, „Рэволюцыйныя песьні", выпуск другі, стар. 9)

Нацдэмы ў музыцы ня хочуць прызнаць клясавай барацьбы нават тады, калі пролетарыят у спэцыяльныя дні робіць агляд клясавай моцы і падрыхтоўкі да клясавай барацьбы.

Пад чырвоны сьцяг народы
Выйсьці з хаты павінны ўсе

(зноў „усе"? С. В.)

Успомніць майскі дзень...
Сьвята згоды; гімн вясьне

(„Дашкольны сьпеўнік" пад рэдакцыяй Мацісона, стар. 40).

Цэргібелі ў першамайскія дні растрэльваюць рабочых, а нацдэмы квакаюць Ды яш э каму?—дзецям. Быццам Першы Май—сьвята ўспамін, сьвята клясавай згоды.

Ва ўсіх музычных творах, да якіх мы мелі доступ амаль няма слоў: пролетарыят, капіталісты, кляса, эксплёатацыя, інтэрнацыяналізм. Слова рабочы сустракаецца вельмі рэдка. Такімі-ж словамі, як: „народ, браце, працоўны, пан, братэрства, згода", насычана кожная песьня Напрыклад:

Наша армія складана
За працоўных—супроць пана.

(Тэраўскі, „Вайск. пес.", стар. 18).

Пан працоўных душыць ўсю[…]
Мы-ж нясем свабоду люду.

(Там-жа, ста[…]

Наш серп зрэжа панскія ру[…]
і г. д. і[…]

Калі і зьяраюцца песьні, к[…] накіраваныя супроць эксплёата[…]дык і то супроць толькі пана. […]меньне „пан" у бел. мове—адно[…] шарнік, памешчык. Гэта не вы[…]васьць. Адкуль-жа можа ўзяцца[…] пасьці ў беларускую музыку к[…]лісты і яго магільшчык проле[…] калі па тэорыі нацдэмаў на Бе[…] капіталізму ня было. Соцыяльну[…] олюцыю і Савецкую ўладу ўт[…] Ясь, з вёскі, ад сахі. Так сьпя[…] „музыкі" ва ўнісон сваім сабра[…]

Некалькі слоў асобна аб „Даш[…]ным сьпеўніку", складзеным Ул[…]пэвіч і А. Савёнак пад рэдакцыя[…]цісона, а таксама і ўласна Мац[…] „Сьпеўнік для дзіцячых хораў"[…]трымкі з якога вышэйпадаены.

Гэтыя „сьпеўнікі" з пункту по[…] педагогікі і педолёгіі зьяўляюц[…] толькі бяздарнымі, а політычна […]нымі. Тут „моладзь, якая мае […] жыццёвага вопыту, мае менш в[…] клясавай барацьбы" (Кагановіч), [...]стаўляецца старым і выпрабава[…] бойках кадрам:

Хто жыцьцю кладзе дарогу?
Ведай, моладзь, гэты ты!

(Стар. 38).

Не інтэрнацыянальнае і кля[…] выхаваньне, а нацыянальнае.

За вольнасьць на ўсім сьвеце[…]
Беларускія вышлі дзеці і г. д[…]

(Стар. 42).

У зборнік уключана і калядная[…] коўная песьня „Саўка і Грышка"[…] к нута слова „каляда", а слова […]стос" заменена хлапец". Ёсьць і[…] песьні для дзяцей:

Ай, туры, да растатуры,
Я шляхецкай сам натуры:
Што суботу ем бліны,
А ў нядзелю-та ўюны.

(Мацісон „Сьпеўні[…] стар. 29).

Як маленькай у матулькі я ж[…]
Як вішанька ў садочку цьвіла[…]
Цьвіла, цьвіла ды пацьвітывал[…]
Лемантарык свой пачытывала.

(Замест „з малайца[…] пагулівала" С. В[…]

А як пашла ў дзіцячы сад, д[…] ходзіць—завяла.

І ў гэтых „сьпеўніках" дзецям […]шчэпліваецца, што сьвята Пер[…] Мая—сьвята згоды. Шкоднасьц[…] тых сьпеўнікаў відавочна: у […] выхаваньня дзяцей у інтэрнацыя[…]ным кірунку,—прывіўка зоолёгі[…]шовінізму, разьвенчваньне [...]альш[…]кага прынцыпу, царкоўшчыну і […]

Усё гэта выразна сьведчыць а[…]яўнасьці ў музыцы контррэволю[…]нага беларускага нацыянал-дэм[…]тызму з яго атрыбутамі: орыен[…] музыкі на буржуазны Захад, ідэа[…]цыя фэўдальнай буржуазнай і цар[…]най самабытнасьці беларускай пе[…]стварэньне музыкі нацыянальнай[…] форме і буржуазнай па зьместу; […]рускі народ—адна сям'я перамо[…] рэволюцыю прышла ад сахі, і […] Як лячыць музыку ад параліч[…] хвароб, будзем гаварыць у адн[…] наступных нумароў газэты.

С. ВЯЗ[…]

## Паштовая скрынка

Забаве—„Аб лесазагатоўках на Тураўшчыне", Шульману—„Плян вывазкі ня выканан", Слаўно—„Аб крымінальным вышуку", „Актывісты" і „Кулацкія замыслы", Бурдзе—„Па-ўдарнаму ўзяцца за работу", Сіротцы—„Ня рыхтуюцца да вясеньняй сяўбы", Бэнэнсону—„Аб лесазагатоўках", Маку—„Замест хлебнага віна купім аблігацыю", Хэйману—„Ніхто ня хоча дапамагаць", Б-НУ—„Бярэце прыклад", Батурэвічу—„Мы ўдзельнікі", Прыбытку „Лепш працаваць ня можам", Быхоўскаму—„Рапарт", Вясёламу—„Што чакае", Хасдану—„Быхаўскія справы", Дарожку—„Савецкая эстафэта ўзьняла актыўнасьць", Сваіму—„Комсамольцы—на лесапрарывы", Янкаўцу—[…]чуць лягчэйшай працы", Пры[…]ку—„Агульная бязьдзейнасьць" „Комсамольскі штурм у лесазага[…]ках", Пічусе—„КСМ—у баву вывазкі", Зоркаму—„Усе сіль[…] выкананьне плянаў лесазагатов[…] Сьвядомаму—„Нядбайнасьць", […]вальніцы—„Попел на сьнезе"—[…]шэйпералічаныя допісы ня бу[…] зьмешчаны з-за адсутнасьці адра[…] дробязных фактаў і спазьненьня[…] друку. Частка з іх накіравана[…] расьсьледваньне.

Час. вык. абав. адк. рэдактар[…]
С. АН[…]

Сёньня, 12 лютага, роўна а 6 гадзіне ўвечары у памяшканьні клюбу мэталістых (Унівэрсытэцкая вул.)

**— адбудзецца працяг —**

**1-ай менскай гарадзкой конфэрэнцыі „ЛК"**

Своечасовая яўка дэлегатаў—пад адказнасьць сакратароў ячэек і начальнікаў штабаў „ЛК".

Оргкамісія Менгаркому ЛКСМБ.



Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599